# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
22 верасня
1994 года
№ 7(1712)


● ЧАЛАВЕК ПЕРШАЙ ПАЛАСЫ

## «ЯКАСЦІ БАЦЬКІ ПЕРАДАЛІСЯ ПА СПАДЧЫНЕ СЫНУ»

***Толькі для нашай газеты — эксклюзіўнае інтэрв'ю з сынам Прэзідэнта Беларусі. Віктар Лукашэнка — студэнт другога курса аддзялення міжнародных зносін гістарычнага факультэта БДУ — доўга не згаджаўся на інтэрв'ю. Але Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка ўсё-такі дазволіў яму сустрэцца з карэспандэнтам «Беларускага універсітэта». На гэтую сустрэчу ён прыйшоў не адзін, а з сябрам, аднакурснікам Ягорам Сліжам. З імі гаворыць Любоў Багданава.***

**— Віця, чаму ты паступіў на гэтае аддзяленне? Наколькі мне вядома, яно рыхтуе палітыкаў-дыпламатаў. Гэта даўнішняя мара ці жаданне пайсці па слядах бацькі?**

— Канешне, гледзячы на свайго бацьку, я ўжо бачыў, якая гэта прафесія. Натуральна, мне гэта падабалася. Я супастаўляў усе магчымасці, бо ісці куды-небудзь на матэматычны факультэт я не мог: дакладныя навукі слабаватыя,— а гуманітарныя заўсёды ішлі. І таму тут усё супала.

**— Сайшлося жаданае з рэчаісным?**

— Так, сайшлося.

**— Ты хочаш стаць такім палітыкам, як бацька? Ён прыклад для цябе?**

— Ну, увогуле так. Ну, або іншая спецыялізацыя якая-небудзь. Можа быць, болей дыпламатам.

**— Віця, што значыць для цябе студэнцкае жыццё? Для некага гэта інтэрнат. А для цябе што?**

— Студэнцкае жыццё амаль такое ж, як у школе. Толькі болей адказнасці і самастойнасці на цябе ўскладаецца. Гэта значыць, ты без усялякай прынукі павінен вучыцца, таму што разумееш, што гэта табе патрэбна.

**— Ты не прапускаеш лекцый?**

— Не, не прапускаю.

**— Канспекты вядзеш так сама старанна, як і на першым курсе?**

— Вяду. Госпадзі, гэта ж ясна, што ў будучыні гэта табе спатрэбіцца.

**— Першы курс ты быў у інтэрнаце?**

— Не, я жыў з бацькам у гасцініцы.

**— А чаму не ў інтэрнаце?**

— Ну, разумееш, інтэрнат — гэта, вядома, добра, але там умовы такія, што вучыцца вельмі кепска.

**— Чым ты займаешся ў вольны час?**

— Спортам і чытаннем.

**— Што ты любіш чытаць?**

— Фантастыку і іншую мастацкую літаратуру.

**— У кіно, тэатры ходзіш?**

— Не, неяк часу пакуль не выпадала.

**— Ягор, вы даўно сябруеце з Віцем?**

— Я ведаю Віцю ўжо два гады і магу сказаць, што ён адзін з тых студэнтаў, якія добра ўжываюцца ў калектыве. Гэтаму спрыяе яго ўменне паводзіць сябе сярод іншых студэнтаў. Ён сціплы, не фанабэрысты, і тое, што яго бацька стаў Прэзідэнтам, не змяніла яго. Я думаю, што якасці бацькі перадаліся па спадчыне сыну.

**— Якія ж?**

— Я б сказаў, уменне карэктна паводзіць сябе з іншымі людзьмі, выслухоўваць іх да канца і, маючы нешта запярэчыць, абгрунтавана даказаць гэта.

**— Віця, ты быў упэўнены ў тым, што твой бацька пераможа?**

— Ну, вядома, я быў упэўнены. Я веры ў у тое, што народ зробіць правільны выбар. Таму што іншага не дадзена. Колькі можна жыць так, як жылі, квітнець таму, што квітнела...

**— Чаму?**

— Ну, вось такому во жыццю, беззаконнасці.

**— Дзякую, хлопцы. Поспехаў вам!**

***Пры перадрукоўцы ўзгадняць з рэдакцыяй «Беларускага універсітэта».***

● ВЕДАЙ НАШЫХ!

## ВІНШУЕМ!





**Галоўны прыз прэстыжнага ў Еўропе міжнароднага музычнага фестывалю, які раз у пяць гадоў праводзіцца ў Даніі, уручаны аркестру народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І хоць беларусы ўдзельнічалі ў конкурсе, што прайшоў сярод духавых аркестраў, пальма першынства дасталася ім.**

**За час знаходжання ў краіне беларускаму аркестру было прапанавана выступіць з канцэртамі ў розных гарадах. І ўсюды музыкантаў сустракалі бурнымі авацыямі і кветкамі. Акрамя таго аркестр адразу ж запрасілі на наступны фестываль у Данію, а таксама на музычнае свята, якое адбудзецца праз два гады ў Швейцарыі.**

● ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

## ПРАЦЯГ РУБРЫКІ

Вітаю цябе, сябра мой, першакурснік! Пяць гадоў— невялікі тэрмін, і хутка ты адчуеш, што студэнцкая пара твайго жыцця заканчваецца. «А ці была яна?» — спытаеш ты сябе. Пакутліва напружваючы памяць, ты ўзгадаеш твары старшакурснікаў, якія зараз вучаць цябе, стараючыся апраўдаць у сваіх вачах час, змарнаваны на пляванне ў столь і пошукі бясплатнай цыгарэты ў калідорах інтэрната. Яны кажуць табе паблажліва: «Так, на першым курсе таксама рабіў гэта і не рабіў гэтага...» Але іх час мінуў, міне і твой.

Учора ці ўжо месяц таму ты упершыню пабачыў свой першы пакой у інтэрнаце. Табе, як першакурсніку, дасталіся, напэўна, самыя прыгожыя апартаменты. Не палохайся аблезлых шпалераў, дзіравых ракавін, карычневых унітазаў, якія ўтульна шыпяць і булькаюць уначы. Можа быць, гэта і ёсць тое, што будзе табе ўзгадвацца з сумам. Не ствары сабе празмернай утульнасці, а то патонеш у ёй і больш ніколі не зможаш пабачыць гульні сонечных промняў на зялёнай лістоце. Чым меней ты маеш, тым больш ты вольны, смелы і дужы.

Звярніся лепей да людзей: суседзяў, сяброў, выкладчыкаў. Завядзі сабе кошку. Гэтая жывёла зручная тым, што калі павесіць яе на сценку ў сетцы-авосьцы, яна з поспехам заменіць табе любімую канарэйку, якая засталася дома. Наведвай заняткі, гэта таксама цікава. Хутка ты забудзеш слова «школа», якое яшчэ не сыходзіць у цябе з языка, і станеш па-іншаму ставіцца да выкладчыкаў. Канешне, ён старэйшы за цябе і ведае болей, але, з другога боку, ён ужо значна бліжэйшы табе, вы з ім ужо амаль роўныя.

Але якасць жыцця залежыць не столькі ад знешніх фактараў, як ад твайго ўспрыняцця свету. Вучыся, рухайся, памятай, што песімізм — гэта самаразбурэнне, і галоўнае — ніколі не адчувай сябе віноўным перад кімсьці за тое, што ты ёсць на свеце.

**А. ПАЎЛОЎСКІ.**

***Матэрыял пад рубрыкай «Школа першакурсніка» чытайце на 3-ай старонцы.***

● ВЕСТКІ З ГАЛОЎНАГА КОРПУСА

● ● ●

13 верасня адбылося першае пасяджэнне каардынацыйнага савета па міжнародных зносінах Белдзяржуніверсітэта на чале з рэктарам. У паседжанні прымалі ўдзел прадстаўнікі ўсіх факультэтаў, НДІ і службаў універсітэта.

Стварэнне каардынацыйнага савета абумоўлена жаданнем адрэгуляваць і гарманізіраваць існуючую канцэпцыю міжнародных зносін. Такім чынам, каб, па-першае, узгадніць інтарэсы асобных супрацоўнікаў ці студэнтаў з інтарэсамі БДУ. Гэта значыць, зрабіць так, каб, напрыклад, камандзіроўкі прадстаўнікоў БДУ за мяжой прыносілі карысць не толькі тым, хто выязджае, але і універсітэту. А па-другое, зрабіць БДУ больш вядомым на міжнароднай арэне, што забяспечыла б універсітэту большую колькасць міжнародных праектаў, праграм, сувязей, а таксама большую якасць фінансаваных паступленняў.

Асноўнымі з разгледжаных дакументаў былі:

1. Палажэнне аб арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў Белдзяржуніверсітэце.

2. Палажэнне аб парадку работы падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта з замежнымі студэнтамі.

3. Палажэнне аб заключэнні кантрактаў з замежнымі грамадзянамі.

● ● ●

Недзе ў сярэдзіне лістапада першая група беларускіх студэнтаў і выкладчыкаў факультэта прыкладной матэматыкі БДУ паедзе на 2 месяцы ў Каліфарнійскі Дзяржаўны універсітэт для навучання там у школе бізнесу і бізнес-інкубатары.

Ведаючы аб складаным эканамічным становішчы, у якім зараз апынулася наша краіна, Каліфарнійскі універсітэт вырашыў дапамагчы БДУ ў падрыхтоўцы спецыялістаў па рыначнай эканоміцы. І не выпадкова ў якасці базы быў абраны менавіта ФПМ. Такі выбар цалкам апраўданы. Таму што ва ўсім свеце эканоміка — гэта перш за ўсё матэматыка, дакладны, дасканалы разлік. І матэматык-прафесіянал у перспектыве — прафесіянал-эканаміст.

Еўраазіяцкі Фонд і Інфармацыйнае Агенцтва ЗША падтрымалі матэрыяльна гэтае шматабяцальнае супрацоўніцтва. А таму вельмі хутка студэнты ФПМ убачаць у сваіх вучэбных пакоях новае камп'ютарнае абсталяванне. І навучанне ў каліфарнійскім універсітэце, не кажучы ўжо аб семінарах, якія ў родным БДУ праводзяць выкладчыкі з Каліфорніі, стане звычайнай, не здзіўляючай нікога з'явай. Мяркуецца стварэнне на базе тэхнапарка і Белдзяржуніверсітэта бізнес-інкубатара, на базе факультэта прыкладной матэматыкі — школы бізнесу. Пры бізнес-школе плануецца цэнтр даследванняў і эканаметрычнага аналізу і мадэліравання.

Хочацца спадзявацца, што гэтая школа здолее падрыхтаваць сапраўдных прафесійных эканамістаў, якія змогуць вывесці нашу краіну з крызісу.

**Вольга ХАДАРЭНКА.**

● САКРЭТ ФІРМЫ

# «ЛЮСТЭРКА ГРАМАДСТВА» З ЕЎРАПЕЙСКІМ АДБІТКАМ

*Узровень развіцця СМІ — адлюстраванне ўзроўню развіцця грамадства. Ісціна даўно вядомая, але чамусьці не засвоеная. Выканаўчы дырэктар «Міжнароднай школы журналістыкі» Вікторыя Казлова, якая сустрэлася з карэспандэнтам «Беларускага ўніверсітэта», імкнецца давесці гэта да ўсіх, хто ўжо зазбіраўся ў школу, якая ў гэтым годзе пачне сваю працу.*

**— Ці з'яўляецца стварэнне «Міжнароднай школы журналістыкі» альтэрнатывай дзяржаўнай форме навучання, а ў прыватнасці факультэту журналістыкі БДУ?**

— Міжнародная школа журналістыкі не з'яўляецца альтэрнатывай дзяржаўнай універсітэцкай сістэме выкладання журналістыкі. У нас розныя мэты і розныя падыходы да іх рэалізацыі. Мы разумеем, што не здольны даць тое, што дае журфак Белдзяржуніверсітэта, але БДУ пакуль не мае праграмы, падобнай да нашай. Дакладней сказаць, што нягледзячы на ўсю розніцу ў падыходах да праблем журналістыкі на Беларусі, а, магчыма, дзякуючы ёй, мы ўдакладняем адзін аднаго ў агульным жаданні садзейнічаць развіццю сродкаў масавай інфармацыі ў нашай Рэспубліцы.

**— Але ўсё ж стаўку вы робіце на дапамогу развіццю недзяржаўных СМІ...**

— Міжнародная школа журналістыкі — факультэт недзяржаўнага Еўрапейскага Гуманітарнага Універсітэта.

**— І менавіта адтуль вы чэрпаеце сродкі на існаванне?**

— Школа створана пры тэхнічным і арганізацыйным удзеле таварыства з абмежаванай адказнасцю «Мас-Медыя Цэнтр», чыя дзейнасць накіравана таксама на падтрымку СМІ.

**— Аб неабходнасці перабудовы сістэмы СМІ Беларусі ў мінулым годзе было заяўлена падчас візіту на Беларусь прадстаўніка Аб'яднанай Еўропы спадарыні Лалюмьер. Вы збіраецеся крочыць па еўрапейскаму шляху навучання?**

— Школа ў Мінску створана па прынцыпу і падабенству еўрапейскіх і амерыканскіх школ для журналістаў. У гэтым годзе яна прапануе два сумесных у адзін курс варыянты адукацыі на 1,5 года кожны: першы — другая спецыяльнасць для асоб, якія ўжо маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Пасля атрымання адукацыі студэнту выдаецца дыплом, які пацвярждае набыццё ім другой спецыяльнасці — «журналіст».

**— Але вы кажаце, што дапаўняеце адукацыю журфака БДУ?**

— Менавіта. Другі варыянт — «Advanced Skill» (павышэнне кваліфікацыі) — курс удасканалення прафесійных навыкаў для працуючых журналістаў. Пры заканчэнні вучобы студэнты атрымліваюць сертыфікат аб заканчэнні «Міжнароднай школы журналістыкі».

**— Колькі будзе каштаваць адукацыя?**

— Яна даецца бясплатна. І гэта пры тым, што праграма навучання ўключае паглыблены курс вывучэння англійскай мовы. Запіс аб вольным валоданні мовай для прафесійнай працы заносіцца ў дакумент, які сведчыць аб сканчэнні школы.

**— Пэўнае ўяўленне аб тым, што прадстаўляе школа журналістыкі складаецца. А як будзе весціся сам працэс навучання?**

— Каб атрымаць дакумент аб адукацыі, які афіцыйна зарэгістраваны, заліцэнзіраваны і дзейнічае на Беларусі, студэнт павінен прайсці праграму, разлічаную на 1.000 гадзін вывучэння спецыяльнасці плюс 600 гадзін вывучэння англійскай мовы. Наша праграма складзена з гэтага разліку. У першым семестры (з кастрычныка да Новага году) асаблівая ўвага будзе нададзена менавіта мове. Студэнты будуць займацца па 4—6 акадэмічных гадзін 5—6 разоў на тыдзень у другой палове дня. З другога семестра больш часу адводзіцца на спецыяльнасць. Зрэшты, дзеля яе арганізатары школы і прыкладаюць намаганні, час і немалыя грошы.

**— Перспектывы тэарэтычнага навучання пытанняў не выклікаюць. Але пры авалоданні імі на практыцы пэўныя цяжкасці ўзнікнуць могуць...**

— Вельмі хутка тэарэтычныя веды саступяць месца практычным: апрацоўка інфармацыі, напісанне інфармацыйных матэрыялаў для радыё, тэлебачання, газеты, тэхніка інтэрв'ю, работа перад камерай, з мікрафонам, мантаж відэаматэрыялаў, макетаванне друкаванага выпуску, праца аддзела навін, праца з міжнароднай базай даных, з электроннай поштай і шмат іншага. Студэнты «Міжнароднай школы журналістыкі» будуць практыкаваць свае магчымасці ў студэнцкайй газеце, якая будзе выдавацца пры садзейнічанні «Міжнароднай сеткі журналістыкі», удзельнічаць у студэнцкай радыёпраграме, дапамогу ў стварэнні якой акажа радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная», а таксама ў студэнцкай тэлевізійнай праграме. Практычныя заняткі будуць у асноўным прадстаўлены вялікай серыяй прафесійных семінараў з удзелам відных журналістаў з Расіі, Польшчы, Украіны, Германіі, іншых краін Еўропы і з ЗША. Мас-Медыя цэнтр цесна супрацоўнічае з рознымі міжнароднымі фондамі, якія займаюцца падтрымкай адукацыйных праграм для журналістаў. Па гэтай лініі мы плануем частку студэнтаў на летнюю стажыроўку альбо пасля сканчэння вучобы накіраваць за мяжу для ўдасканалення ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі.

**— Колькі чалавек вы набіраеце ў школу?**

— Міжнародная школа журналістыкі ў гэтым годзе прымае 10—15 студэнтаў.

**Гутарку вёў К. ЮРАСЬ.**

● АКТУАЛЬНА

# ВАЕННАЯ КАФЕДРА ЯК СРОДАК ІСНАВАННЯ. АЛЬБО ПАХАВАННЯ?

**Чуткі пра недабор у войска бударажаць апошнім часам тую палову насельніцтва, што ў мэтах набыцця так неабходных ведаў засела ў прыдыхлых подыхам гісторыі аўдыторыях ВНУ. І недарма менавіта на іх, хлапцоў ад 18 да 27 гадоў, кінуў свой позірк новы міністр абароны Беларусі Анатоль Кастэнка, бо менавіта гэта частка беларускай моладзі, на яго думку, і павінна сфарміраваць стратэгічны патэнцыял беларускага войска. Будучы ж «патэнцыял» і чуць не чуў пра наканаваную яму гісторыяй роль, бо ні вяваць, ні абцяжарваць свой розум практычнымі ведамі аб дакладным складзе роты або батальёна ён («патэнцыял») адкрыта не збіраўся, задавольваючы свае інтэлектуальныя патрэбы на ваенных кафедрах ВНУ, надмацоўваючы сваю ўпэўненасць з недакранальнасці канцэпцыі «нейтральнай дзяржавы», што была зацверджана на сесіі ВС Беларусі.**

**Па звестках, набытых у палкоўніка аддзялення ваеннай адукацыі Упраўлення кадрамі Міністэрства абароны, пакуль канкрэтнага рашэння аб скарачэнні ваенных кафедр у ВНУ рэспублікі не прынята. Хаця ў ходзе абмеркавання праекта новай праграмы ваеннай адукацыі падобнага роду спрэчкі час ад часу ўзнікаюць.**

**Кафедры існуюць у сценах 10 навучальных устаноў — Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага і Мінскага медыцынскіх інстытутаў, БДУ, БДПА, Гомельскага універсітэта транспарту, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінскага авіяцыйнага коледжа грамадзянскай авіяцыі. Там праходзяць 20—30% ад агульнай колькасці юнакоў-студэнтаў.**

**Аднак, ёсць занепакоенасць, што ў будучым навучальным годзе ваенныя кафедры застануцца толькі ў БДУ, БДПА і БДУІР. Ва ўсякім разе, так гавораць выкладчыкі кафедры ў БДУ, спасылаючыся на рыхтуючуюся пастанову Міністэрства абароны.**

**Юрась КАРМАНАЎ.**
**Сяргей ХРЫПАЧ.**

# ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ

Паводле ўказання УДАІ МУС РБ № 22/312 ад 5 жніўня 1994 г. у горадзе Мінску праводзіцца аперацыя «Аўтобус» (з першага верасня па трыццатае верасня 1994 года). Асноўныя задачы — актывізацыя папераджальна-прафілактычнай работы ў аўтагаспадарках, якія маюць аўтобусы, па забяспячэнню бяспекі дарожнага руху, умацаванню дысцыпліны вадзіцеляў, павышэнню ўзроўню тэхнічнага стану аўтобусаў, а таксама забяспячэннем правільнай арганізацыі перавозак пасажыраў на аўтавакзалах і аўтастанцыях.

За 8 месяцаў 1994 года ў Мінску адбылося 408 дарожна-транспартных здарэнняў. Пры гэтым загінула 42, паранена 456 чалавек. Па віне вадзіцеляў усіх транспартных сродкаў здарылася 173 ДТЗ. Загінула 23, паранена 239 чалавек. У тым ліку вадзіцелямі ў нецвярозым стане ўтворана 44 ДТЗ. Загінула 4, паранена 63 чалавекі. З іх індывідуальнымі ўладальнікамі тэхнічных сродкаў утворана 115 ДТЗ. Загінула 12, паранена 160 чалавек. У тым ліку ў нецвярозым стане адбылося 40 ДТЗ. Загінула 4, паранена 57 чалавек.

Па віне пешаходаў адбылося 191 ДТЗ. Загінула 16, паранена 176 чалавек, У тым ліку ў нецвярозым стане пешаходамі ўтворана 76 ДТЗ. Загінула 2, паранены 75 чалавек.

За гэты перыяд адбылося 78 ДТЗ з удзелам дзяцей. Загінула 4, паранена 79 дзяцей.

Вадзіцелямі, якія зніклі з месца здарэння, утворана 31 ДТЗ. Загінулі 2, паранена 29 чалавек.

Віноўнікамі ДТЗ з'яўляюцца і веласіпедысты: імі ўтворана 9 ДТЗ. Паранена 11 чалавек.

Парушаюцца Правілы дарожнага руху студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ. Без правоў затрыманы студэнты Медлеў Я. В., Ханько А. В., за перавышэнне хуткасці — Рытус У. У., Войніч С. У.

Не прышпілілі рамні бяспекі Бондараў В. В., Кавалёў А. А.

Старшы навуковы супрацоўнік Шчэрбіч Ю. М. па артыкулу 117 Правілаў дарожнага руху 12 жніўня 1994 года пакараны на 20 000 рублёў.

Вадзіцелі і пешаходы! Калі вы жадаеце шчасця і здароўя сабе і сваім блізкім, будзьце дысцыплінаванымі! Заўсёды выконвайце Правілы дарожнага руху!

**Дзяржаўтаінспектар Маскоўскай ДАІ**
**І. ЧУМАК**

● НАША ЗДАРОЎЕ

# НЕБЯСПЕЧНАЯ «ГОСЦЯ»

Эпідэмічная сітуацыя па халеры ў свеце абвастрылася, найбольшае распаўсюджванне яна атрымала ў Дагестане, куды была завезеная паломнікамі ў чэрвені-ліпені з Саудаўскай Аравіі.

Хроніка эпідэміі.

Масква — зарэгістравана 14 выпадкаў халеры.

Дагестан — на 23 жніўня ад халеры скончаліся 18 чалавек. Выяўлена 633 хворых і 613 вібрыяносьбітаў.

Калмыкія — з падазрэннем на захворванне халерай шпіталізавана 5 чалавек.

Уладзімір — 3 чалавекі з вобласці, якія адпачывалі ў Індыі (бацькі і сын), трапілі ў інфекцыйную бальніцу, дзіця прызнана вібрыяносьбітам.

Барнаул — выяўлена 4 выпадкі халеры.

Омск — выяўлены адзін хворы на халеру.

## ПРАФІЛАКТЫКА ХАЛЕРЫ

Эпідэміі халеры, спустошваючы свет XIX стагоддзя, былі настолькі лютымі, што страх перад імі не забыты дагэтуль. Людзі гінулі ад гэтай хваробы амаль ва ўсіх краінах свету.

У Расіі больш за сто гадоў (з 1817 па 1926 гг.) халера зносіла тысячы жыццяў. З 1926 г. гэтая хвароба ў СССР не сустракалася. Тым не менш, небяспека пранікнення ўзбуджальнікаў халеры ў нашу краіну захоўваецца.

У 1961 г. пачалася новая эпідэмія халеры, але гэта была ўжо не класічная азіяцкая халера. Цяпер віноўнікам халеры стаў вібрыён Эль-Тор, які трапляе з Інданезіі.

Захворванне, выкліканае гэтым відам узбуджальніка халеры, па свайму ходу і выніках праходзіць некалькі лягчэй, чым класічная халера. І ўсё ж такія свойствы гэтай інфекцыі, як раптоўнасць з'яўлення, хуткасць распаўсюджвання і верагоднасць смяротнага выніку на працягу некалькіх гадзін, калі неабходныя меры для лячэння хворага не прынятыя своечасова, адносяць яе ў шэраг найбольш сур'ёзных хвароб.

Характэрнай праявай халеры з'яўляюцца багатыя вадкія спаражненні — да 20 л у суткі! Значыць, як ні пры якой іншай інфекцыі хворы выдзяляе ў наваколле з выпаражненнямі і рвотнымі масамі вялізную колькасць ўзбуджальнікаў.

## ЯК АДБЫВАЕЦЦА ЗАРАЖЭННЕ

Халера перадаецца кантакта-побытавым шляхам, водным, харчовым. Пры кантактна-побытавым шляху заражэнне халерай узнікае праз брудныя рукі, навакольныя прадметы, а таксама праз ежу.

Заражэнне праз ваду — адзін з галоўных шляхоў. Вібрыёны трапляюць у ваду разам са спаражненямі. Рэкі, сажалкі могуць быць інфіцыраваны водамі каналізацыйных сцёкаў (калі яны не абясшкоджаны). Харчовыя прадукты могуць быць заражаны вібрыёнам двума шляхамі: пры выкарыстанні ўжо заражонай сыравіны або ў працэсе апрацоўкі, калі ў прыгатаванні ежы ўдзельнічаюць невыяўленыя вібрыяносьбіты ці хворыя.

## ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ЗАХВОРВАННЕ

Праявы халеры разнастайныя: побач з цяжкімі формамі, якія заканчваюцца смерцю, халера можа праходзіць як умераннае растройства страўнікава-кішачнага тракта. Інкубацыйны перыяд, г. зн. схаваны перыяд хваробы ад пачатку заражэння да праяўлення хваробы, доўжыцца ад некалькіх гадзін да сямі дзён. Захворванне пачынаецца без падвышэння тэмпературы, раптоўна, часцей за ўсё ноччу: з'яўляецца багаты вадкі ўсё больш часты панос без напружання і хваравітасці, хутка далучаецца рвота, а ў цяжкіх выпадках — сутаргі. Надыходзіць хуткае абязводжванне арганізма, тэмпература рэзка падае да 34—32°, голас хворага становіцца бязгучным. Змяншаецца або зусім спыняецца мочааддзяленне. Смерць можа настаць у першыя ж суткі.

Існуюць спецыяльныя правілы для асабліва небяспечных захворванняў, да якіх адносіцца і халера. Паводле гэтых правілаў кожны чалавек павінен ведаць, што пры падазрэнні на халеру неабходна неадкладна выклікаць доктара. Да яго прыходу ніхто з тых, хто знаходзіцца ў кватэры хворага, не павінен выходзіць з яе. Кватэру трэба закрыць і нікога, апроч медыцынскіх работнікаў, не ўпускаць. Усе выдзяленні трэба збіраць у асобнае закрытае накрыўкай вядро. Нельга выліваць іх у каналізацыю ці ва ўборную. Тыя, хто меў зносіны з хворымі, павінны старанна вымыць рукі, змяніць верхняе адзенне, скласці бруднае ў адным месцы. Да прыходу доктара забараняецца прымаць ежу і піць ваду.

## ПАМЯТАЙЦЕ МЕРЫ АСАБІСТАЙ ПРАФІЛАКТЫКІ ХАЛЕРЫ

Каб прадухіліць заражэнне гэтай цяжкой хваробай, трэба выконваць наступныя правілы:

1. Старанна сачыць за чысцінёй рук: мыць іх з мылам перад прыгатаваннем і прыёмам ежы, перад кармленнем дзіцяці, пасля кожнага наведвання прыбіральні, коратка стрыгчы пазногці, не дапушчаць збірання бруду пад імі.

2. Ваду з адкрытых вадаёмаў, неўпарадкаваных калодзежаў піць толькі пасля кіпячэння, не ўжываць некіпячоную ваду з выпадковых крыніц ні для піцця, ні для мыцця посуду.

3. Купацца толькі ў спецыяльна адведзеных месцах.

4. Садавіну, гародніну, ягады ўжываць толькі мытымі ў праточнай вадзе.

5. Захоўваць чысціню ў кватэрах і месцах агульнага карыстання.

6. Ахоўваць ад мух харчовыя прадукты, не пакідаць ежу адкрытай, брудны посуд неадкладна прыбіраць і мыць.

7. Асабліва старана захоўваць ад забруджвання харчовыя прадукты, якія ўжываюць без папярэдняй цеплавой апрацоўкі (смятану, сыр, хлеб і інш.), малако толькі кіпяціць, тварог разважны ці прыгатаваны з сырога малака ўжываць толькі ў вараным ці смажаным выглядзе (сырнікі, варэнікі, запяканкі).

8. Пры з'яўленні першых прыкмет любога кішэчнага расстройства неабходна тэрмінова звярнуцца да доктара.

9. Не займайцеся самалячэннем!

**Загадчык гастраэнтэралагічнага аддзялення 2-ой гарадской клінічнай бальніцы**
**Р. ПАНАС.**

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# ДЗЕ ЗНАХОДЗІЛАСЯ СТАРАЖЫТНАЯ БЕЛАЯ РУСЬ

## Першыя ўспаміны тэрміна «Белая Русь»

У гістарычнай навуцы доўгі час панавала думка аб тым, што старажытная Белая Русь знаходзілася па-за межамі сучаснай Беларусі.

Так, аўтары «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», спасылаючыся на В. М. Тацішчава, сцвярджаюць, што «Белая Русь» — назва зямель паўночна-ўсходняй Русі ў XII—XV ст. і Беларусі з XIV ст. Паводле В. М. Тацішчава, тэрмін «Белая Русь» упершыню ўпамінаецца пад 1135 г. пры назве Растова-Суздальскага княства.

У энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» гэтае пытанне трактуецца так: «Белая Русь, назва некаторых зямель Паўночна-Усходняй Русі ў XII—XV ст. і Беларусі з XIV ст. У гістарычных дакументах тэрмін «Белая Русь» ужываўся ў дачыненні да Уладзіміра-Суздальскага княства, а ў XIII—XIV ст. — да Маскоўскіх, Смаленскіх і Пскоўскіх зямель» .

Як бачым, энцыклапедычныя даведнікі аднадушна сцвярджаюць, што ў XII ст. тэрмін «Белая Русь» адносіўся толькі да Растова-Суздальскай зямлі, а ў адносінах да тэрыторыі сучаснай Беларусі гэта назва пачынае ўжывацца з першай паловы XIV ст. Пры гэтым аўтары названых вышэй артыкулаў спасылаюцца выключна на «Гісторыю Расійскую» В. М. Тацішчава, быццам бы іншыя крыніцы адсутнічаюць. Але ж звернемся спачатку да «Гісторыі Расійскай» В. М. Тацішчава, дзе чытаем: «1097. Съезд к Киеву всех князей для разобрания дел земских, на который съехались к Любечу: Давид Святославич Черниговский, брат его Олег Тмутороканский, Владимир Всеволодович Переяславский, Давид Игоревич, Василько Ростиславович Перемышельский... И по съезде князей объявил Святополк им... своим отеческим владеть и не преступать, а имянно: Святополку с сыновцы, яко сыну и внукам Изяславлим — Туров, Слуцк, Пинск и все городы до Буга по оной стороне Припяти, яко великому князю—Киев со всею областию, что ко оному принадлежит, до реки Горыни, и Новгород Великий к Киеву. Святославским сынам — предел отца их, Чернигов с Северою, Вятичи, Муром и Тмуторокань. Владимиру — удел отца его: всю Белую Русь, Ростов, Смоленск и Суздаль; Давиду сыну Игореву — Владимир и Луцк по Горынь, а Владимирским внукам Ростиславичам — все Червенские городы: Червень, Перемышль, Теребовль и протчие...» (Татищев В. Н. История Российская. — М., 1963, т. II, с. 110). Такім чынам, у гісторыі В. М. Тацішчава тэрмін «Белая Русь» упершыню ўжываецца пад 1097 годам, а не пад 1135. Як бачым, Белая Русь не атаясамліваецца з Растова-Суздальскай зямлёю, не з'яўляецца Растова-Суздальскім княствам, а выступае як асобнае ўладанне і пералічваецца разам з Растовам, Смаленскам і Суздалем: «Владимиру всю Белую Русь, Ростов, Смоленск и Суздаль».

Пад 1157 г. у В. М. Тацішчава ёсць і такое цікавае паведамленне пра Белую Русь. Размова ідзе аб усё той жа спадчыне бацькоў і аб праве нашчадкаў валодаць тымі ці іншымі землямі. Наўгародскі князь Расціслаў звяртаўся ў 1157 г. да свайго стрыечнага брата Мсціслава, сына Юрыя Даўгарукага: «Брате, мы равные внуки Владимировы. Он же по себе Великое княжение русское отдал старшему сыну своему, а моему отцу; твоему же отцу с Лесною и Польскою землями Белую Русь. И в том они безпрекословно жили». (Татищев В. Н. История Российская. М., 1964, т. III, с. 61). «Польская земля» — гэта так званае «Поле» — назва, якая неаднаразова сустракаецца ў працах В. М. Тацішчава: «Народы в сей части сарматские: меря, ныне Ростовское, криви или креви, т. е. верхние — ныне Смоленское, Тмутаракань или Мордва — ныне Рязанское и Нижегородское, Мурома и доднесь, Поле, где Суздаль, Володимер и прочая». (Татишев В. Н. Избранные труды по географии России. М. 1950, с. 110).

Такім чынам, паводле В. М. Тацішчава Суздаль і Уладзімір знаходзяцца ў «Полі», «Польскай зямлі», якая ні ў якім разе не атаясамліваецца з Белаю Руссю, а таму і Растова-Суздальскае княства не магло атаясамлівацца з Белаю Руссю. Тым больш, што і зараз паблізу ад Суздаля існуюць горад Юр'еў-Польскі і сяло Польскае, заснаваныя ў XII ст.

Паводле таго ж В. М. Тацішчава назва «Белая Русь» у большая ступені адносілася да зямель Заходняй Русі, у тым ліку і да Полаччыны, чым да Усходняй Русі, да Растова-Суздальскага княства.

«Новгород в нахождение татарское республичское правление сусче во многом подобное римскому имели, однако всегда великих князей за главу почитали. Ровно же тому Псков и Полоцк особные республики к Новугороду сообщены были, пока первые два Иоан III Великий, а последнюю (Полоцк) Литва под власть свою покорила». (Татишев В. Н. Избранные труды по географии России.— М. 1950, с. 109). І далей В. М. Тацішчаў канстатаваў: «Чрез всё время татарской власти равномерно перемены пределов происходили. Литовские князи, власти русской отдав, многия княжения и сусче всю Червоную, яко же и Белою Русию овладали».

Такім чынам, у першым выпадку «Литовские князи Белою Русию овладали», а ў другім — «Полоцк Литва под власть свою покорила». Безумоўна, Полацк — гэта горад у Белай Русі. Наколькі вядома, Вялікае княства Літоўскае, ніколі не валодала Растова-Суздальскаю зямлёю, а вось Полаччына доўгі час уваходзіла ў склад Літоўскай дзяржавы. А калі так, дык ці магла назва «Белая Русь» адносіцца да Растова-Суздальскага княстваў? Безумоўна, што не. Але, каб канчаткова пераканацца ў тым, што сцверджанні асобных аўтараў аб тым, што тэрмін «Белая Русь» гэта першапачатковая назва зямель паўночна-усходняй Русі, а Беларусі толькі з XIV ст.», не мае пад сабой падставы, звернемся да іншых крыніц.

Акрамя «Гісторыі Расійскай» В. М. Тацішчава існуе «Хроніка Польская, Літоўская, Жмудская і ўсёй Русі» Мацея Стрыйноўскага. Вядома, што «Хроніка» ўпершыню была надрукавана ў 1582 годзе, амаль на два стагоддзі раней за «Гісторыю Расійскую» В. М. Тацішчава.

Як і В. Тацішчаў, М. Стрыйкоўскі падчас працы над «Хронікай» карыстаўся летапісамі, хронікамі і іншымі крыніцамі, якія не захаваліся да нашага часу. «Хроніка» М. Стрыйкоўскага дае больш дакладныя звесткі адносна пытання, дзе знаходзілася старажытная «Белая Русь», і аб часе з'яўлення назвы «Белая Русь».

«Наш хронікар рускі Нестор піша,— падкрэсліваў М. Стрыйкоўскі,— іж у Пскове месте Белоруском,— (бо была Ольга псковітянка) на первое от всех (мовит) збудовала церков». (Гістарычны слоўнік беларускай мовы.— Мн., 1982, т. 1, ст. 271).

Такім чынам, Пскоў — горад у Белай Русі. Княгіня Вольга магла збудаваць царкву ў «Пскове месте Белоруском» толькі пасля яе хрышчэння ў Візантыі.

Пачатак выкарыстання тэрміна «Белая Русь», такім чынам, можна вызначыць, прыблізна, сярэдзінай X ст. Белая Русь у гэтым выпадку атаясамліваецца з Пскоўскай зямлёю.

«У астатнія гады,— працягваў далей М. Стрыйкоўскі,— з таго чаму ўсе Рускія; Белай, Усходняй, Паўночнай і на поўдні лежачай Русі народы ў веры Хрысціянскай, згодна абрадаў і цэрымоній Грэчаскіх пад верхаводствам Патрыяха Канстанцінопальскага пачалі ў паважанасці трымацца, так ёсць ад часу стварэння Света 6497, згодна Рускім і Грэчаскім хронікам розным».

Год 6497 ад стварэння свету ёсць 989 год. Таму яшчэ ў часы князя Уладзіміра назва «Белая Русь» была раўназначна тэрміну «Заходняя Русь». Хутчэй за ўсё на ўвазе меліся Пскоўшчына і Полаччына, якія знаходзіліся на захадзе Старажытнарускае дзяржавы. Яны і ёсць Белая Русь. У той жа час Растова—Суздальскае княства — гэта паўночны ўсход старажытнай Русі.

Цяжка ўявіць, што ў XII ст. назва «Белая Русь», якая ў X ст. адносілася да Заходняе Русі, «мігрыравала» на ўсходнюю Русь, а ў XIV ст. вярнулася на захад. Сёння гісторыя не мае прыкладаў двайной міграцыі назвы зямель у межах Старога Света. Па іншаму склалася ў Новым Свеце, землям якога еўрапейскія каланісты давалі назвы сваіх родных мясцін у Еўропе. Гэта тым больш малаверагодна і з той прычыны, што «міграцыя» «Белай Русі» адбывалася б у межах адной Старажытнарускай Дзяржавы.

Таму ёсць падставы меркаваць, што тэрмін «Белая Русь» заўсёды лакалізаваўся ў межах сучаснай Беларусі з частковым адхіленнем арэалу яго распаўсюджвання на поўнач і ўсход уздоўж яе сучасных граніц.

**Ігар ШУМСКІ.**
**БДУ. Кафедра Гісторыі Беларусі.**

# ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ПРА КАХАННЕ...

**Усім вядомая старая жартоўная кваліфікацыя тыпаў кахання, дзе студэнцкае гучала так: «Есть с кем, есть чем, но нет где». Гэта можа здацца пошлым і рэзкім, але сярод моладзі зараз рэдка можна пачуць аб высокай духоўнай любові, а асноўныя праблемы закаханых утрымліваюцца менавіта ў вышэйпрыведзеным выказванні.**

**Займацца каханнем, рабіць любоў — які сэнс мелі гэтыя выразы ў мінулым стагоддзі, мы не ведаем. Але для сучаснага маладога чалавека гэта заўжды з'яўляецца адной з межаў мараў і жаданняў. Усё пабудавана так, што нават самы страшэнны імпатэнт лічыць сваім абавязкам увесь час разсказваць навакольным пра свае любоўныя перамогі. Любоўныя яны сапраўды ці ён проста пераказвае эратычную сцену з фільма «Мяне завуць Арлекіна» — гэта прыносіць яму бясспрэчны аўтарытэт, інтрыгуючы і выклікаючы зайздрасць сяброў і ворагаў. Вам вядомая, напэўна, сцэна, калі ў кампаніі хто-небудзь раптам перапыняе ўсіх: «Цішэй, дайце я паслухаю гэтую песню. Я кахаў пад яе калісьці сваю першую (пятуюсёмую) жанчыну». Так робяць самыя хітрыя. У большасці ж хлопцы бессаромна распавядаюць магчымыя і немагчымыя гісторыі, ад якіх часта пахне сюррэалізмам, парушэннямі псіхікі на падставе комплекса непаўнавартасці, эратычнымі снамі і нават проста нерэальнасцю з пункту погляду фізіялогіі і анатоміі. Асабліва шануюцца ўсемагчымыя нетрадыцыйныя формы секса з садамазахісцкім ухілам.**

**Можа ўзнікнуць страх за нашую будучыню, калі ўявіць, што такія настроі пануюць сярод моладзі. Але асаблівых прычын для трывогі няма. Гэта хвароба ўзросту — не фізічнага, каляндарнага, а ўзросту маральнага, псіхалагічнага. Канешне, мужчыны назаўжды застаюцца дзецьмі — байкі такога роду існуюць у мужчынскіх колах любога ўзроўню, але ўсё гэта становіцца больш блізкім да праўды, салідным, сур'ёзным і... чыстым. Праблема, магчыма, болей нават у тым, што сучасны малады чалавек арыентуецца ў асноўным на Дон Жуана, а не, скажам, на Казанову. Колькасць у нас дагэтуль больш прэстыжная за якасць — водгукі планавай эканомікі. Будзем спадзявацца, што рынак і тут усё паставіць на месца.**

**Увогуле, у студэнцкім асяродку, як мне здаецца, можна назіраць некалькі тыпаў любоўных стасункаў. Большую частку складаюць так званыя грамадзянскія шлюбы, якія ў наступным пераходзяць або не пераходзяць у афіцыйныя. Гэтыя адносіны будуюцца на аснове раўнапраўя ці альфансавання. Адна студэнтка на пытанне мамы, чаму ў яе няма сябра, адказала: «Каб утрымліваць у інтэрнаце хлопчыка, яго трэба карміць, выгульваць і спаць з ім. А мне няма калі». Мужчына ж, якому не трэба харчаванне, цяпло і ласка, але які любіць перш за ўсё свабоду і незалежнасць, аддае перавагу адной ці некалькім сяброўкам, якія, натуральна, не могуць жыць у адным месцы і бачыць яго пастаянна. І ўсё ж вышэйшай марай кожнага з'яўляецца нечаканая рамантычная прыгода, поўная таямніцы, пачуццёвасці і раскаванасці, асаблівым шармам якой з'яўляецца кароткачасовасць. Ёсць дзяўчаты, якія прыязджаюць вучыцца з адной мэтай — выйсці замуж за багатага хлопца, які неабавязкова быў бы прыгожым або моцным, а проста не выклікаў бы агіды і меў мінскую прапіску. Але я думаю, што вы не адносіцеся да гэтага цынічнага племені, паважаныя.**

**А каханне працягваецца. Не ў такой ступені, як здаецца ці як магло б быць, але нашым гэта падабаецца не менш, чым іхнім. Інтэрнат, вядома, не самае зручнае месца для гэтага, бо звычайна ўсе: ад суседа да вахцёркі — ведаюць, хто, з кім, дзе і як. Але і ў тых, хто жыве спакойна, ёсць свае праблемы. Напрыклад, апошнім часам сталі папулярнымі пошукі і распазнаванне сярод знаёмых «галубнякоў». Ні ў чым не вінаватых людзей завочна абвінавачваюць у гомасексуальных схільнасцях, абмяркоўваюць, шэпчуцца і хіхікаюць. Гэта стала падобна на выяўленне яўрэяў з агульнай чалавечай масы. Аднак не будзем пра гэта.**

**«Як жа нашы студэнты прыходзяць да ложка?» — спытаеце вы. У дзяўчат свае сакрэты. Хлопцы ж ідуць да яго простай дарогай. Ложак з'яўляецца канчатковай мэтай для псіхалагічна недаспелага, але фізічна квітнеючага арганізма. Толькі пазней малады чалавек заўважае, што часта мімалётныя эратычныя ўражанні, эмоцыі, атрыманыя ў самых нечаканых сітуацыях, значна больш прыемныя за простае механічнае дзеянне.**



**Выраз «Зачем любить, зачем страдать, ведь все пути ведут в кровать» належыць людзям, якія не ўмеюць бачыць у жанчыне жанчыну, не ведаюць, што такое флірт. Значыць, яны не маюць уяўлення пра тое, што такое секс (пра каханне я ўжо не кажу).**

**У першыя дні свабоды, калі ў цябе кружыцца галава ад самастойнасці, розны бруд здаецца прывабным, таямнічым і хвалюючым. Але спыніся. Тое гэта, чаго табе так хацелася, ці ты зможаш пераступіць гэты неабавязковы этап і адразу перайсці да вартых формаў зносінаў, якія характэрызуюць цябе як мужчыну і як асобу ўвогуле?**

**А. ПАЎЛОЎСКІ.**
***Малюнак В. ХАДАРЭНКА.***

